Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-12-08

# Сяброў прыроды зашмат не бывае

**У Брэсце прайшла абласная педагагічная канферэнцыя "Вопыт і перспектывы экалагічнай адукацыі Брэсцкай вобласці". Арганізатарамі двухдзённага мерапрыемства, прысвечанага 65-годдзю экалагічнага руху Брэстчыны, выступілі абласное ўпраўленне адукацыі і абласны эколага-біялагічны цэнтр навучэнцаў.**

Канферэнцыя, на якой былі прэзентаваны асноўныя напрамкі і перспектывы развіцця экалагічнай адукацыі ў вобласці, праводзілася з мэтай абагульнення і распаўсюджвання эфектыўнага вопыту работы педагогаў і павышэння іх кампетэнтнасці.

— На Брэстчыне назапашаны цікавы вопыт у рэалізацыі розных экалагічных праектаў, у тым ліку такіх, якія не маюць аналагаў у іншых рэгіёнах нашай краіны, — расказала дырэктар абласнога эколага-біялагічнага цэнтра навучэнцаў І.М.Жуковіч. — У вобласці дзейнічаюць 958 гурткоў эколага-біялагічнага кірунку, дзе займаюцца больш за 11 тысяч школьнікаў. 5 устаноў дадатковай адукацыі маюць эколага-біялагічны профіль. Дзеці ахвотна займаюцца ў розных экалагічных аб'яднаннях — школьных лясніцтвах, экалагічных атрадах, зялёных і блакітных патрулях. Так, сёлета, дзякуючы школьным лясніцтвам, на 304-х гектарах з'явіліся зялёныя насаджэнні, былі нарыхтаваны амаль дзве тоны насення. У школах працуюць музеі прыроды, створаны экалагічныя сцяжыны і вучэбна-доследныя ўчасткі. Вучні актыўна ўдзельнічаюць у шматлікіх экалагічных акцыях і конкурсах.

Абласны эколага-біялагічны цэнтр навучэнцаў цесна супрацоўнічае з Брэсцкім дзяржаўным вытворчым лесагаспадарчым аб'яднаннем, абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, абласным упраўленнем МНС, нацыянальным паркам "Белавежская пушча", установамі вышэйшай адукацыі, Палескім аграрна-экалагічным інстытутам НАН Беларусі, мемарыяльным комплексам "Брэсцкая крэпасць-герой", рэспубліканскім заказнікам "Прыбужскае Палессе" і Брэсцкім міжраённым грамадскім аб'яднаннем голубаводаў і аматараў дэкаратыўных птушак. Дзякуючы ўзаемавыгаднаму супрацоўніцтву, паспяхова вырашаюцца многія пытанні, звязаныя з экалагічным выхаваннем моладзі.

Вялікая ўвага ўдзяляецца рабоце з адоранымі дзецьмі. Здольныя школьнікі займаюцца ў навуковых таварыствах вучняў і абласной вочна-завочнай (дыстанцыйнай) школе па экалогіі, удзельнічаюць у экалагічных злётах і экспедыцыях. Адным з прыярытэтных напрамкаў экалагічнай адукацыі з'яўляецца работа па энергаэфектыўнасці і энергазберажэнні.

Па словах І.М.Жуковіч, існаванне сеткі ўстаноў дадатковай адукацыі эколага-біялагічнага профілю мэтазгоднае і эфектыўнае. На жаль, апошнім часам у гэтых установах назіраецца цякучасць кадраў.

Загадчыца арганізацыйна-масавага аддзела БАЭБЦН Г.І.Уварава расказала пра фарміраванне экалагічнай культуры вучняў праз удзел у доўгатэрміновых экалагічных праектах:

— Спалучэнне розных форм, метадаў і сродкаў — адна з умоў выхавання экалагічнай культуры ў школьнікаў. Увагу неабходна акцэнтаваць не толькі на тэорыі, але і на практычнай дзейнасці. Вывучэнне глабальных праблем на аснове мясцовага, даступнага і значнага для дзяцей матэрыялу змяняе матывацыю іх учынкаў і адлюстроўваецца на паводзінах школьнікаў у прыродным асяроддзі.

У БАЭБЦН распрацаваны доўгатэрміновы праект "Захаваем жывы свет прыроды Брэстчыны", скіраваны на стварэнне ўмоў для фарміравання ў вучняў экалагічнай культуры. Праект выхоўвае актыўную грамадзянскую пазіцыю школьнікаў праз беражлівае стаўленне да прыроды, далучае дзяцей да практычнай дзейнасці па ахове прыродных багаццяў, развівае пазнавальныя інтарэсы навучэнцаў і іх уменні самастойна здабываць веды.

Праект арыентаваны на стварэнне асаблівай сацыяльна-педагагічнай прасторы, дзе галоўным выхаваўчым асяроддзем з'яўляецца асяроддзе равеснікаў, што дазваляе падлеткам больш хутка і трывала засвойваць сацыяльны вопыт, фарміраваць асобасныя якасці, уласныя погляды і перакананні.

Удзельнікі праекта — члены экалагічных аб'яднанняў Брэстчыны, з якіх фарміруецца абласны валанцёрскі экалагічны атрад са зменным складам. У рамках праекта былі рэалізаваны абласныя акцыі "Зямля — наш дом" і "Лес — для будучых пакаленняў", якія ўключалі рэкламна-прапагандысцкія мерапрыемствы на вуліцах Брэста, працоўныя дэсанты па пасадцы дрэў, догляд заяснымі масівамі, берагамі рэк і азёр, маніторынг экалагічнай культуры моладзі і вывучэнне мясцовых экалагічных праблем.

Выяўленню і замацаванню інтарэсаў вучняў да эколага-біялагічных даследаванняў садзейнічае абласная экалагічная экспедыцыя "Мой родны край". Аб'ектамі даследаванняў яе ўдзельнікаў з'яўляюцца прыродныя тэрыторыі Брэстчыны, якія асабліва ахоўваюцца. Гэты доўгатэрміновы даследчы праект бярэ пачатак яшчэ ў 1993 годзе.

За час рэалізацыі праекта вучні ў складзе экспедыцыйных атрадаў батанікаў, заолагаў і гідрабіёлагаў пабывалі ў нацыянальным парку "Белавежская пушча", заказніках "Дзівін — вялікі лес", "Прыбужскае Палессе", "Бугскі", "Барбастэла" і "Выганашчанскае", а таксама ў старых сядзібных парках. Важна, што спецыялісты запаведнікаў успрымаюць дзіцячыя даследчыя лабараторыі паўнапраўнай часткай даследчага працэсу. Улічваючы тое, што ў распараджэнні школьнікаў няма абсталявання, якое дазваляе праводзіць хімічныя аналізы, даследчая экспедыцыя збірае, апрацоўвае і апісвае прыродныя аб'екты.

Педагог дадатковай адукацыі Эколага-біялагічнага цэнтра Баранавіч Ю.В.Траццяк падзялілася цікавым вопытам праектнай дзейнасці ў арніталогіі па захаванні гняздоўяў сокала-пустальгі ва ўмовах горада. Дырэктар Экалагічнага цэнтра Белаазёрска Н.У.Дзямянцей расказала пра рэалізацыю праектаў "Дзікі квадрат" (вывучэнне відавога саставу сухадольнага лугу), "Вада ў калодзежы: што мы п'ём?" і "Трусіная эстафета", а таксама пра работу 25-кіламетровага зялёнага маршруту "Радасць ад перасоўвання", інфармацыйнага цэнтра па ўстойлівым развіцці і экатурызме, а таксама фітабара.

Ёсць чаму павучыцца ў арганізацыі работы па добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторыі ў сярэдняй школе № 3 Бярозы.

— Гэтаму напрамку работы ў нашай навучальнай установе даўно ўдзяляецца павышаная ўвага, — прызналася настаўніца працоўнага навучання загадчыца школьнага вучэбна-доследнага ўчастка Т.М.Красуліна. — Усе работы па азеляненні школьнай тэрыторыі вядуцца ў рамках урокаў працоўнага навучання і біялогіі, заняткаў грамадска карыснай працай. Летам да добраўпарадкавання прыцягваюцца дзеці з нядобранадзейных сем'яў.

Навучэнцы вырошчваюць расаду, садавіну і агародніну, якія потым прадаюць. На тэрыторыі школы размешчаны яблыневы і водарны сады, створаны калекцыйны ўчастак "Аптэкарскі агарод". У добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторыі малыя архітэктурныя формы ўдала спалучаюцца з зялёнымі насаджэннямі. Нядзіўна, што ў розных экалагічных конкурсах калектыў школы заўсёды займае прызавыя месцы.

Выкладчыца хіміі Белаазёрскага дзяржаўнага ПТК электратэхнікі Л.У.Бялецкая прэзентавала работу калектыву па праграме "Зялёныя школы Беларусі". У навучальнай установе рэалізоўваецца сумесны міжнародны праект па энергазберажэнні, ажыццяўляецца даследчая работа па вывучэнні біяразнастайнасці Бярозаўшчыны. У клубе "Праметей" працуе мабільная выстава энергазберагальных тэхналогій і альтэрнатыўных крыніц энергіі.

Навучэнцы каледжа праводзяць акцыі "Замяні поліэтыленавы пакет на сумку з матэрыі", "Захавай дрэвы ў лесе" і "Збор аднаразовых батарэек". Ва ўстанове распрацаваны турыстычны маршрут па родным краі, арганізоўваюцца працоўныя дэсанты, ладзяцца "экалагічныя атакі".

Падобны вопыт работы назапашаны і ў Ганцавіцкім дзяржаўным прафесійным ліцэі сельскагаспадарчай вытворчасці. Даволі вынікова экалагічная работа з высокаматываванымі дзецьмі вядзецца ў Цэнтры дзіцячай творчасці Целяхан Івацэвіцкага раёна, гімназіі № 3 Баранавіч, Кобрынскім эколага-біялагічным цэнтры навучэнцаў, Эколага-біялагічным цэнтры дзяцей і моладзі Пінска і Эколага-біялагічным цэнтры Баранавіч.

Удзельнікі канферэнцыі наведалі зімовы сад БрДУ імя А.С.Пушкіна і азнаёміліся з работай міжфакультэцкага цэнтра экалогіі і прыродазнаўства. Завяршылася канферэнцыя круглым сталом "Прыродныя тэрыторыі Брэстчыны, якія асабліва ахоўваюцца. Іх міжнароднае значэнне".

**Сяргей ГРЫШКЕВІЧ.**
*hryshkevich@ng-press.by*
**Фота аўтара.**

Сяргей Грышкевіч. Сяброў прыроды зашмат не бывае